# Візітная картка выбараў

У СССР выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных і Вярхоўны Савет саюзных рэспублік былі неардынарнай падзеяй у жыцці грамадства. Яны суправаджаліся святочнай атмасферай і дарылі іх удзельнікам не толькі пачуццё прыналежнасці да найважнейшых палітычных акцый краіны, але і станоўчыя эмоцыі, а таксама пазітыўны настрой на ўвесь перыяд выбарчай кампаніі. Своеасаблівай візітнай карткай выбараў служылі афіцыйныя запрашальныя лісты-паштоўкі з заклікам з'явіцца на выбарчыя ўчасткі і прагаласаваць за ўпадабанага кандыдата. Каларыстычна насычаныя і змястоўныя, яны, трапляючы ў паштовыя скрыні грамадзян за некалькі дзён да галасавання, загадзя стваралі святочны настрой у выбаршчыкаў і спрыялі актыўнай грамадзянскай пазіцыі. Фактычна кожны запрашальны ліст – гэта творчая праца мастака з элементамі савецкай сімволікі і індывідуальным вырашэннем вобразнай прасторы, што асабліва характэрна для перыяду канца 1930-х і 1950-х гадоў. Яны былі не сухімі інфармацыйнымі лістамі, а, па сутнасці, сапраўднымі творамі плакатнага мастацтва і сёння па праву ўяўляюць сабой гістарычную і мастацкую каштоўнасць.

1940




1953




1955




1958




1961






1965




1965




1966




1967




1969




1970




1971




1975




1985




1990




**Запрашальныя лісты з калекцыі Вячаслава Ясевіча**